артыкулаў, што змешчаны ў разнастайных зборніках, у перыядычным друку. Аднак яны канстатуюць сабой этап «першапачатковага назапашвання» навуковага капіталу і маглі б стаць зыходным пунктам для дысертацыйнай працы, якая навукова пацвердзіла б жыццёвую і мастацкую годнасць паняцця «беларуская фартэпіянная школа». Адным з вынікаў такога даследавання магла б з'явіцца распрацоўка спецыяльнага раздзела ў кансерваторскім курсе «Гісторыя фартэпіяннага мастацтва» і яго ўвод ў вучэбную праграму, а таксама уключэнне гэтага матэрыялу ў выглядзе асобных тэм у курс методыкі для музычных вучылішчаў. Гістарычны аспект гэтых ведаў дазволіць навучэнцам скласці больш поўнае ўяўленне аб сваёй «музычнай генеалогіі» і адчуць сябе звяном у ланцугу бесперапынных музычных традыцый.

Мы рабілі спробу прааналізаваць магчымыя ракурсы пастаўленай праблемы. У якасці найбольш натуральнага і поўнага разглядаецца варыянт сінхроннага вывучэння педагагічнай і выканальніцкай сфер, што маюць відавочную ўзаемасувязь у працэсах развіцця і ў дасягненнях.

Асобна разглядаюцца перспектывы развіцця фартэпіяннага мастацтва ў рэспубліцы ў святле творчых поспехаў апошняга часу, арганізацыйных і метадычных намаганняў усіх структур адукацыйнай вертыкалі. Рэформа вышэйшай музычнай адукацыі патрабуе пастаяннага навуковага асэнсавання і аналізу.

Сукупнасць усіх з'яў і падзей у беларускім фартэпіянным выканальніцтве і педагогіцы робіць гэтую галіну перспектыўным і прыцягальным аб'ектам даследавання.

**Залатухін В.А.,**
**дацэнт**

## СЦЭНІЧНЫЯ ЭЦЮДЫ ПА ТВОРАХ ВЫЯЎЛЕНЧАГА МАСТАЦТВА

Прафесія рэжысёра патрабуе ўмення ствараць цэласны твор тэатральнага мастацтва -- спектакль, у якім усе кампаненты падпарадкоўваюцца адзінаму ідэйна-вобразнаму вырашэнню.

У працэсе навучання работа з эцюдамі па карцінах мастакоў з'яўляецца першай спробай аб'яднаць усе кампаненты ў адзіны цэласны твор. Канкрэтнасць задання аблягчае яго разуменне і затым выкананне. Прычым студэнты павінны захаваць галоўную думку твора.

Дакрананне да высокай класікі вучыць глядзець і бачыць навакольны свет, абвастрае светапогляд студэнта, развівае яго назіральнасць. У той жа час вялікія мастакі даюць будучым рэжысёрам яшчэ адзін урок тыпізацыі, абагульнення з'яў.

Калі раней студэнт, ствараючы эцюды на вольную тэму, у асноўным ахопліваў розумам асобныя элементы сцэнічнай дзеі і пабудовы простага «падзейнага рада», карыстаючыся асабістымі назіраннямі і жыццёвым вопытам, то ў рабоце па стварэнню эцюдаў па творах мастакоў перад ім стаіць задача узнаўлення задумы аўтара, што складае асноўную, прынцыповую асаблівасць творчасці рэжысёра.

Бачны вобраз падзеі, ўзноўлены на палатне мастака, можа быць засвоены толькі праз разуменне глыбіннага сэнсу з'яў, сканцэнтраваных ў ідэі твора выяўленчага мастацтва, для сцэнічнага ператварэння якога неабходна выкарыстаць ўсе выразныя сродкі тэатра.

Высвятленне ідэі праз шэраг жыццёва праўдападобных падзей патрабуе скрупулёзнай педагагічнай працы з акцёрам, каб стварыць яркі сцэнічны вобраз ў пошуках формы эцюда, якая ў гэтым выпадку будзе прадыктавана аўтарам карціны. Студэнт вучыцца адшукваць тэмпарытм дзеяння, мову мізансцэн, пластычнае вырашэнне дзеля выяўлення ідэйна-сэнсавай сутнасці ў зададзеным стылі, жанры, выкарыстоўваць афармленне, святло, шумы, музыку ў кампанаванні сцэнічнай прасторы.

У паступовам сцэнічным дзеянні разгортваецца «падзейны рад». «Жыццё чалавечага духу» знаходзіць праз акцёра канкрэтнае выяўленне ў сцэнічным вобразе.

Такім чынам, стварэнне сцэнічнага эцюда па карціне мастака ў мініяцюры нагадвае працэс стварэння спектакля.

Стварэнне сцэнічнага эцюда па творах жывапісу ўжо ў першы год навучання раскрывае перад студэнтам складанасць выбранай прафесіі і, пакуль у элементарнай форме, няўмольна патрабуе ад яго ведаў і ўмення, здольнасці і працы.

Сцэнічная выразнасць нараджаецца ад найбольш глыбіннага раскрыцця ўнутранай сутнасці. Для гэтага студэнту неабходны навыкі ўвасаблення вобразнага бачання.

Адначасова з засваеннем прафесійных навыкаў студэнт развівае асабістую псіхатэхніку: мастацка-вобразнае мысленне і псіхалагічнае сумяшчэнне рацыянальнага і эмацыянальнага ў тэатральнай творчасці.

І галоўнае – акрэсліваць асабістую маральна-духоўную пазіцыю.

Гэты важны этап у набыцці прафесіі мае ўплыў і на іншыя старонкі выхавання студэнта.

Багацейшая спадчына найбуйнейшай у свеце славянскай школы тэатральнай адукацыі арганічна ўваходзіць у навучальны працэс і актыўна выкарыстоўваецца выкладчыкамі кафедры тэатральнай творчасці ў іх планавай дзейнасці.

Асэнсаванне вопыту па выхаванню студэнтаў рэжысёрскіх спецыялізацый метадам стварэння сцэнічных эцюдаў па творах мастакоў лагічна падштурхоўвае да думкі аб спробе прымянення ў навучальным працэсе эцюдаў па творах скульптараў і майстроў дакументальных і мастацкіх фотаздымкаў.

Гэта задума патрабуе дасканалага і абгрунтаванага выніку практычна-творчага эксперыменту працяглясцю 1 - 1,5 месяцы ў адной з груп кафедры тэатральнай творчасці Беларускага універсітэта культуры.

**Рынкевіч У.І.,**
дацэнт

## РЭАЛІЗАЦЫЯ ТВОРЧАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ СТУДЭНТАЎ НА ЗАНЯТКАХ ПА ЖЫВАПІСЕ

Галоўнай задачай навучальных мастацкіх устаноў з'яўляецца падрыхтоўка спецыялістаў з трывалымі ведамі і навыкамі ў галіне выяўленчага мастацтва, здольных да мастацтва, здольных да актыўнай творчай працы. Таму вельмі важна, каб вывучэнне асноўных законаў і авалоданне выразнымі сродкамі тых ці іншых відаў мастацтва спалучалася з набыццём вопыту самастойнай мастацкай практыкі.

Прапанаваны матэрыял з'яўляецца вынікам абагульнення вопыту выкладання дысцыпліны «Жывапіс» на 1-2 курсах спецыялізацыі «народныя рамёствы». Праграма прадмета пабудавана па прынцыпу паступовага пашырэння значнасці элементаў творчага пачатку ў вучэбных заданнях, а таксама прадугледжвае стварэнне ўмоў для самастойнай творчай працы студэнтаў. Найбольш складаныя аўдыторныя заданні выконваюцца мастаком-выкладчыкам паралельна з работай вучняў.

На першапачатковым этапе навучання пераважнай формай заняткаў па жывапісе з'яўляецца праца з натуры. Аднак наша задача не зводзіцца да перадачы студэнтам вонкавага падабенства нацюрморта або краявіда. Натура выконвае ролю аб'екта рэчаіснасці, на аснове якога складаюцца кампазіцыя танальных плямаў і сістэма колеравых адносін з пэўнай доляй умоўнасці. З аднаго і таго ж аб'екта адлюстравання можа быць створана некалькі варыянтаў работ, якія адрозніваюцца кампазіцыяй, каларытам, прыёмам выканання. Асноўнай цяжкасцю для першакурснікаў з'яўляецца пераадоленне інерцыі размалёўкі контураў выявы і набыццё ўмення мысліць колеравымі адносінамі, ствараць гармонію колераў. У далейшым задача ўскладняецца перадачай матэрыяльнасці рэчаў і стварэннем багацця жывапісных фактур.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ